12. Мунчаев Р. М., Смирнов К. Ф. Памятники эпохи бронзы в Дагестане (Курганная группа у ст. Манас) // Советская Археология. – Вып. XXVI. – Москва: Из-во АН СССР, 1956. – С. 167–203.
13. Пахомов Э. А. Мингечаурское кувшинное погребение // «Бакинский рабочий». – 14 февраля 1937 г.
14. Петров В. А. Этноботаника Нагорного Карабаха. – Баку: Из-во АзФАН СССР, 1940. – 167 с.
15. Петров В. А. О растительных остатках Мингечаура. – Стенограмма доклада, прочитанного на Отделении общественных наук АН Азеоб. ССР, 4 мая 1949 г.
16. Руденко С. И. Древнейшие в мире художественные ковры и ткани из оледенелых курганов Горного Алтая. – Москва: Искусство, 1968. – 136 с.
17. Терпиловский Р. В. Ранние славяне Подесенья III—V вв. – Киев: Наукова Думка, 1984. – 124 с.
18. Azərbaycan tarixi (Z. M. Bünyadov və Y. B. Yusifovun redaktəsi ilə). I c. – Bakı: Azərnəşr, 1994. – 680 s.
19. Cəfərov H. F. Azərbaycan e. ə. IV minilliyin axırı –I minilliyin əvvəllərində (Qarabağın Qarqarçay və Tərtərçay hövzələrinin materialları əsasında). – Bakı: Elm, 2000. – 187 s.
20. Dyson R. H. Sciences Meet in Ancient Hasanlu, Natural History // The Journal of the American Museum of Natural History. – Vol. LXXIII. – New York, October 1964. – Pp. 16–25.
21. Qaşqay S. M. Manna dövləti. – Bakı: Azərnəşr, 1993. – 107 s.
22. Göyüşov R. B. Azərbaycan arxeologiyası. – Bakı: İşıq, 1986. – 186 s.
23. İsmayılov Q. S. Quruçay və Köndələnçay vadisində qədim mədəniyyət izləri. – Bakı: Elm, 1981. – 64 s.
24. Luckenbill D. D. Ancient Records of Assuria and Babylonia. Vol. I. – Chicago: The University of Chicago Press, 1926. – 313 pp.
25. Vahidov R. M. Mingəçevir III-VIII əsrlərdə (Arxeoloji qazıntı materialları əsasında). – Bakı: AzSSR EA, 1961. –161 s.


**Віёла Казаніна** (Мінск)
аспірант кафедры беларускай
і сусветнай мастацкай культуры БДУКМ,
магістр мастацтвазнаўства

## Апісанне артэфактаў матэрыяльнай культуры казакаў у беларускім познетрадыцыйным фальклоры

У 1648 годзе ў Брэст-Літоўску за «посылане якіхсь лістоў і пороху до козаков» Багдана Хмяльніцкага прадстаўнікамі каралеўскай гвардыі Рэчы Паспалітай і гайдукамі мясцовага ваяводы Анджэя Масальскага быў зняволены і расстраляны Апанас Філіповіч [4, 341]. Ён з'яўляўся грамадскім і рэлігійным дзеячам, бліскуча адораным пісьменнікам, публіцыстам, паэтам і кампазітарам эпохі ранняга барока на Беларусі [7, 76], пазней вядомым як Святы Апанас Берасцейскі. Усё жыццё Апанас Філіповіч актыўна выступаў супраць палітыкі асіміляцыі і паланізацыі беларусаў і ўкраінцаў, якую праводзіў польскі кароль Уладзіслаў IV Ваза (1595–1648), і яго сейм, як і іх папярэднікі – свецкія і рэлігійныя магнаты Рэчы Паспалітай XVI–XVII стагоддзяў. Менавіта берасцеец Апанас Філіповіч пакінуў адны з першых у пісьмовай літаратуры Беларусі ўзгадванні пра казакаў, змаганне з якімі Рэчы Паспалітай ён характарызаваў як «...з козакамі ўнутранюю вайну непатрэбную» [4, 338]. У беларускай жа літаратуры вуснай – народных песнях, казках, легендах, паданнях, прыслоўях, часам, бытуючых дагэтуль, – казакі і іх матэрыяльная культура ўзгадваюцца надзвычай рэгулярна і маляўніча, асабліва ў творах фальклору познетрадыцыйнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Познетрадыцыйны фальклор (так званая «познетрадыцыйная класіка песень») беларусаў складаецца з такіх жанраў як песні казацка-сялянскай сацыяльнай лірыкі: чумацкія, батрацкія і рэкруцкія песні; песні-канты. Усе яны маюць шчыльную сувязь з архаічным раннетрадыцыйным вусным мастацтвам Беларусі (аснова якога – каляндарная і сямейная абраднасць мясцовых земляробаў [3, 3]), але сфарміраваліся значна пазней за яго. Некаторыя з песень позднетрадыцыйнай фальклорнай класікі пачалі выконвацца беларусамі ў XVI стагоддзі (песні-канты пад уплывам ідэй і культуры Рэфармацыі); частка – у XVII стагоддзі (песні казацка-сялянскай сацыяльнай лірыкі пад уплывам тагачасных сялянскіх і казацкіх паўстанняў і войнаў), а большасць – у канцы XVIII стагоддзя (рэкруцкія – пад уплывам увядзення Расіяй на тэрыторыю Беларусі рэкруцкіх набораў пасля падзелу Рэчы Паспалітай, чумацкія і батрацкія пасля адмены прыгону ў 1861 годзе). Таму канчаткова позднетрадыцыйная класіка вылучылася ў асобную групу з канца XVIII–сярэдзіны XIX стагоддзяў.

Форма і змест песень гэтай групы фальклору беларусаў – мастацкі і этнакультурны дакумент эпохі. Яны відавочна падпалі пад моцны ўплыў заходнееўрапейскага прафесійнага мастацтва (беларускія канты), украінскага фальклору (казацка-сялянская сацыяльная лірыка, чумацкія і батрацкія песні беларусаў) ды расійскай вуснай народнай творчасці (рэкруцкія песні). Як і раннетрадыцыйная класіка песень, познетрадыцыйны фальклор беларусаў – ускосная, але даволі важная і досыць інфарматыўная крыніца для вывучэння розных аспектаў культуры апісанных у ім народаў, этнасаў і сацыяльных груп. Па іх змесце можна даведацца аб культуры не толькі светапогляднай ды паводзіннай, але – і аб культуры матэрыяльнай. Казакі, іх паводзіны, маёмасць, вопратка і узбраенне перыядычна ўзгадваюцца ў асобных позднетрадыцыйных фальклорных тэкстах беларусаў. Асабліва шмат звестак пра іх – у песнях казацка-сялянскай сацыяльнай лірыкі, што заўважна нават з назвы песень гэтага раздзела вуснай народнай творчасці беларускага народа.

Спецыяльных даследаванняў апісання помнікаў матэрыяльнай культуры казакаў у фальклоры беларусаў дагэтуль не праводзілася. Таму, для дасягнення мэты артыкула – *ахарактарызаваць спецыфіку прадстаўлення артэфактаў матэрыяльнай культуры казакаў у беларускім познетрадыцыйным фальклоры* – першапачаткова было неабходна акрэсліць агульныя вектары даследавання і аб'ём матэрыялу, які неабходна для дасягнення мэты прааналізаваць. У выніку даследаванне праводзілася ў наступных напрамках: аналіз сацыяльна-гістарычных абставін, якія абумовілі з'яўленне казакаў на беларускіх тэрыторыях; аналіз характару крыніц, якія прадстаўляюць казакаў у помніках фальклору беларусаў; аналіз зместу фальклорных помнікаў Беларусі, якія апісваюць матэрыяльную культуру казакаў.

Беларусь XVI–XVII стагоддзяў не мела аб'ектыўных сацыяльна-гістарычных, эканамічных і геапалітычных абставін для з'яўлення аўтахтонных (мясцовых па паходжанні) супольнасцей, падобных на казацкія суполкі Украіны. Яна была даволі шчыльна заселена шматнацыянальным насельніцтвам, пакрыта сеткай гарадоў, мястэчкаў і вёсак (мал. 1), не мела, як Украіна, малазаселеных вялікіх стэпавых прастораў, якія нікім рэгулярна не пільнаваліся і, такім чынам, пакідалі патэнцыял для засялення самаарганізаванымі і вольналюбівымі суполкамі незалежных ваяроў, якія не толькі бараніліся ад варожага наваколля, але і наладжвалі набегі на суседзяў. Украіна XVI–XVII стагоддзяў мела надзвычай развітую казацкую субкультуру, адлюстраваную ў вуснай народнай творчасці ўкраінцаў і ў іх тагачасных і пазнейшых творах выяўленчага мастацтва (мал. 2).«Імпарт» казацтва з Украіны, які меў месца ў тагачасных беларускіх землях, быў невыпадковы і абумоўлены «...супярэчлівымі гістарычнымі абставінамі складвання беларускай народнасці, яе мовы і культуры ва ўмовах адсутнасці нацыянальнай дзяржаўнасці. Асабліва абвастраецца становішча напрыканцы гэтага перыяду – у XVI–XVII стагоддзях» [5, 24]. Невыпадкова, што ў вольналюбівых казакаў Украіны XVI–XVII стагоддзяў на беларускіх землях было шмат аднадумцаў і спачуваючых, перадусім сярод тых, хто прагнуў волі і вызвалення ад прыгнёту, асіміляцыі і паланізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што з усіх тагачасных сацыяльна-этнічных груп Вялікага княства Літоўскага найбольш прыгнечанымі і пазбаўленымі правоў былі пераважна праваслаўныя беларускамоўныя прыгонныя сяляне, якія апрацоўвалі зямлю, якая з'яўлялася ўласнасцю буйных і дробных феадалаў (магнатаў, шляхты і клірыкаў княства). З канца XV стагоддзя магнаты Беларусі «…атрымалі шырокую магчымасць прадаваць сельскагаспадарчыя прадукты, асабліва зерне на заходнееўрапейскіх рынках. Колькасць дарагога панскага адзення, ювелірных упрыгожанняў, прысмакаў і іншага багацця залежыла ў першую чаргу ад прададзенага зерня» [9, 33]. Дасціпнасць каласальнага прыбытку ад землеўладання і спадарожнай яму раскошы вымагала шалёную прагу да моцнай сялянскай эксплуатацыі, якую ўсё больш апалячаныя і дыстанцыраваныя ад свайго народа магнацкія фаміліі Беларусі XV–XVII стагоддзяў, фактычна, бескантрольна праводзілі на ўласных землях. А актыўна дапамагалі ім гэта рабіць падначаленыя ім прадстаўнікі дробнай ваенізаванай шляхты, наёмныя эканомы ды ўпраўляючыя магнацкіх маёнткаў, замкаў, палацаў і фальваркаў, судовыя улады ды каталіцкія і ўніяцкія клірыкі Вялікага княства Літоўскага – пераважна гарадское і местачковае досыць заможнае насельніцтва.

Сяляне ж беларускіх земляў XVI–XVII стагоддзяў былі амаль пазбаўлены чалавечай годнасці і правоў. У канцы XVI стагоддзя трэцім Статутам Вялікага княства Літоўскага (1588), падрыхтаваным канцлерам княства Астафіям Валовічам (1520–1587) і падканцлерам Львом Сапегам (1557–1633), усталёўваецца дваццацігадовы тэрмін вышуку збеглых сялян землеўладальнікамі і, фактычна, канчаткова замацоўваецца поўная ўлада феадалаў княства над жыццём і смерцю сваіх прыгонных. У выніку прыняцця Брэсцкай царкоўнай уніі па ініцыятыве біскупа берасцейскага і ўладзімірскага Іпація Пацея і біскупа луцкага Кірылы Тарлецкага (1596) да сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, які цярпелі беларусы ў феадальнай Рэчы Паспалітай, далучаецца прыгнёт рэлігійны. Уніяй была моцна абмежавана ў сваіх правах праваслаўная рэлігія (большасць вернікаў якой у тагачаснай Беларусі былі сялянамі) ды знішчаны толькі-толькі з'явіўшыеся парасткі пратэстантызму, які змог бы аб'яднаць нацыю і паменшыць сацыяльную напругу на землях Беларусі. Пераважна прапольскі і пракаталіцкі настроеныя магнаты Рэчы Паспалітай паслядоўна праводзілі антыбеларускую палітыку цягам стагоддзяў. Такім чынам, праз больш чым сто гадоў пасля апошняга Статута ВКЛ і Брэсцкай уніі ў 1697 годзе канчаткова выціскаецца з ужытку ў судзе і дзяржаўных установах Рэчы Паспалітай беларуская мова, і з гэтага года польскі сейм забараняе ўжываць беларускую мову ў дзяржаўных дакументах.

На беларускіх землях XVI–XVII стагоддзяў пастаянна ўзмацнялася сацыяльная, эканамічная і нацыянальна-рэлігійная няроўнасць, што не магло не выклікаць нарастаючы сацыяльны пратэст значных частак грамадства як у вёсцы, так і ў горадзе. Пра вялікія тагачасныя сацыяльныя, эканамічныя і рэлігійныя праблемы адкрыта выказваліся не толькі сяляне і рамеснікі, але адукаваныя і заможныя грамадзяне Вялікага княства Літоўскага. Украінска-беларускі філолаг і раннебарочны пісьменнік, выпускнік філасофскага факультэта Віленскай езуіцкай акадэміі, архімандрыт Дзерманскага кляштара Мялет Сматрыцкі (1578–1633) у сваім польскамоўным творы «Θρηνος toi est Lamenti edyney S. Powszechney Apostolskiey Wschodniey Cerkwie» («Трэнас, альбо плач усходняй царквы»), надрукаваным у 1610 годзе ў Вільні, акрамя рэлігійнай палемікі жорстка ставіць праблему «…дэнацыяналізацыі і акаталічвання мясцовай знаці. Гэты небяспечны для народа і радзімы працэс пачынаў ахопліваць і паглынаць не толькі феадальныя вярхі, але і значную частку служылай шляхты і нават мяшчанства» [4, 318]. Ігумен берасцейскі Апанас Філіповіч (Святы Апанас Берасцейскі) скардзіўся на парушэнні правоў праваслаўных вернікаў з боку канцлера Альбрэхта Станіслава Радзівіла і падканцлера Марцыяна Трызны нават з трыбуны палаты сенатараў варшаўскага вальнага сейма, а караля Уладзіслава IV папярэджваў, што за няўважлівасць да праблем народа «…дознаете запевне гневу божого» [4, 334]. Простыя прыгнечаныя людзі Беларусі не выкарыстоўвалі палеміку, а моўчкі браліся за зброю. А людзей «падпрыгнётам» у той час была большая палова мясцовага насельніцтва. Барацьба большасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускага народа супраць сацыяльнага, эканамічнага і нацыянальнага прыгнёту адзначылася перш за ўсёш матлікімі ўзброенымі выступамі сялян і гарадскіх раменнікаў XVI–XVII стагоддзяў – вельмі часта насамрэч масавымі выступамі, якія ператвараліся з шэрагу выпадкаў у моцныя народныя паўстанні. Мясцовыя па паходжанні паўстанні надзвычай жорстка і вельмі хутка падаўляліся магнатамі, паколькі сяляне і раменнікі не маглі на роўных супраць стаяць добра ўзброенай і спрактыкаванай у войнах шляхце ды прафесійным наёмным войскам Радзівілаў, Сапег і іншых магнацкіх родаў Беларусі.

Але, калі супраць магнатаў выступалі дасведчаныя і спрактыкаваныя ваяры – украінскія казакі, – да якіх далучаліся сяляне і раменнікі Беларусі, спыніць барацьбу большасці народа за свае правы магнатам было ўжо даволі цяжка. Да 1590 года адносіцца выступленне казачых атрадаў Мацюшы і Голага ў раёне Быхава, сумесны напад іх на



Мал. 1. Рэканструкцыя панарамы Слуцка (уверсе) і Брэст-Літоўска (унізе), XVI–XVII стагоддзі

Быхаўскі замак ды захоп горада Быхава. Неўзабаве на Беларусь перакінулася адно з найбольш значных сялянска-казацкіх паўстанняў на Украіне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі (1560–1597). Як адзначаюць беларускія даследчыкі: «…атрад яго з'явіўся на тэрыторыі Беларусі ў лістападзе 1595 года, маючы ў сваім складзе тысячу чалавек украінскіх сялян і казакаў. У кароткі час паўстанне ахапіла раёны Слуцка, Магілёва, Быхава, Рэчыцы, Пінска. Адначасова з атрадамі Севярына Налівайкі (мал. 3) у Беларусі дзейнічалі казацка-сялянскія атрады Савулы і Панчохі. У студзені 1596 года Налівайка сышоў на Украіну і звёў з сабой больш за тысячу чалавек беларускіх сялян і гараджан, якія ўліліся ў яго атрад цягам барацьбы з мясцовай шляхтай (разам – больш за дзве тысячы чалавек)» [5, 22]. Менавіта падзеі канца XVI стагоддзя ў сумежжы Беларусі і Украіны заклалі перадумовы да шэрагу сацыяльных канфліктаў і катастроф, але, адначасова, яскравых і драматычных гістарычных падзей, якія «абрынуліся» на беларускія землі ў XVII стагоддзі, калі тут дзейнічаў казацка-сялянскі атрад Марціна Небабы (мал. 3) і іншых казацкіх палкоўнікаў.

«Сацыяльныя выбухі» XVI стагоддзя, на жаль, не навучылі магнатаў Беларусі больш уважлівым і людскім адносінам да свайго народа ў XVII стагоддзі. Аб інтэнсіўнай эксплуатацыі, прыгнёце, галечы, татальным бяспраў'і тагачасных беларускіх сялян захавалася шмат сведчанняў людзей, якія такія праявы назіралі. Усе яны сыходзіліся на тым, што няма, відаць, на свеце людзей больш шматпакутных, бедных і пазбаўленых

РЕПОЗИТОРИЙ

правоў, чым сяляне Беларусі XVII стагоддзя. Даследчыкі адзначаюць, што ў XVII стагоддзі «…шыбеніцы сталі звычайнай прыналежнасцю магнацкіх двароў – феадал ні за што мог забіць, павесіць селяніна. Адной з распаўсюджаных форм барацьбы сялян супраць прыгнёту сталі ўцёкі ад пана на тэрыторыю Украіны, у прыдняпроўскія стэпы, «на ніз», як гаварылі тады. Шырокі ўдзел беларускіх сялян у стварэнні Запарожскай Сечы не выклікае сумнення ў даследчыкаў. Выхадцы з Беларусі былі і сярод казацкай старшыны – бліжэйшага акружэння гетмана» [9, 33]. Украінскі гісторык польскага паходжання Вячаслаў Ліпінскі сцвярджаў, што «…казацкія палкоўнікі Бутрым, Грамыка, Ждановіч, Нячай, Хведаровіч з'яўляліся па паходжанні беларусамі. Ён выказваў меркаванне, што бацька Багдана Хмяльніцкага, як і блізкі паплечнік Хмяльніцкага Ян Сакалоўскі, перасяліўся на Украіну з Беларусі. Прозвішчы казакаў, якія былі ўнесены ў рэестр 1649 года, сведчаць, што сярод іх было шмат выхадцаў з-пад Пінска, Турава, Мазыра, Брагіна, Магілёва, Слуцка, Навагрудка, Лоева, Чэрыкава, Мсціслава, Бялыніч і інш. Беларускія сяляне і гарадская бедната склалі ядро казацкіх атрадаў, якія пасылаў на Беларусь Хмяльніцкі. К канцу 1648 года паўстанні ахапілі значную частку тэрыторыі Беларусі, прыблізна па лініі Брэст – Слонім – Навагрудак – Мінск – Беразіно» [9, 34]. Працяглыя напружаныя і драматычныя падзеі тых часоў пакінулі моцны, дагэтуль адчувальны адбітак у мастацтве вуснай традыцыі беларусаў – у беларускім фальклоры.

Казацкім, рэкруцкім, антыпрыгонніцкім песням беларусаў прысвечаны асобны том акадэмічнага фальклорнага зводу «Беларуская народная творчасць» з назвай «Сацыяльна-бытавыя песні». Сама серыя, якую рыхтавалі і выдавалі навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, сёння ўключае каля 60 тамоў (якія друкаваліся з 1970 па 2007 гады) і з'яўляецца адным з найбольш аўтарытэтных фальклорных зводаў Беларусі. У томе «Сацыяльна-бытавыя песні» [8] прэзентаваны найбольш характэрныя ўзоры мясцовых тэкстаў казацкіх, рэкруцкіх, антыпрыгонніцкіх песень. Паводле гэтага тома, усяго з 1846 па 1984 гады на тэрыторыі Беларусі было запісана і надрукавана 342 вартыя ўвагі даследчыкаў сацыяльна-побытавыя песні беларусаў. З іх 185 – казацкіх. Гэтыя песні запісвалі, апрацоўвалі і публікавалі бліскучы шэраг славянскіх фалькларыстаў. Сярод іх – пераважна польскамоўныя і рускамоўныя збіральнікі фальклору эпохі беларускага «літвінізму» XIX стагоддзя, калі самавызначэнне беларусаў як нацыі «шукала выйсце» з-за імперскіх кратаў: Ян Чачот (1796–1847), Аскар Кольберг (1814–1890), Зінаіда Радчанка (1839–1916), Міхал Федэроўскі (1853–1923) і Еўдакім Раманаў (1855–1922); а таксама фалькларысты часоў БНР і БССР Мітрафан Доўнар-Запольскі (1867–1934), Максім Гарэцкі (1893–1938), Язэп Зданові́ч (1898–1951); прадстаўнікі мастацтвазнаўства незалежнай суверэннай Рэспублікі Беларусь Ніл Гілевіч (1931–2016), Уладзімір Раговіч (1938–2005), нашы сучаснікі Галіна Таўлай (нарадзілася ў 1946 годзе) і Тамара Варфаламеева (нарадзілася ў 1944 годзе).

У цікавых і змястоўных помніках познетрадыцыйнага фальклору Беларусі часам даволі складана правесці дакладную «інфармацыйна-ідэнтыфікацыйную мяжу» паміж узгаданымі ў тэкстах а) казакамі-змагарамі супраць магнатаў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай; б) украінскімі казакамі з далучанымі да іх беларусамі ў змаганні супраць царызму; в) беларускімі жаўнерамі, забранымі ў рэкруты ў Расію (паколькі на службе ў царызма XIX–XX стагоддзяў таксама былі «казакі»). Паводле тэкстаў песень беларусаў, акрамя апісанняў казацка-сялянскіх паўстанняў у Рэчы Паспалітай XVI–XVIIстагоддзя, з аднога боку, назіраецца відавочна сур'ёзнае супрацьстаянне «казакі [8, 72, 83, 150, 151, 153], запарожскія казакі, запарожскае войска [8, 237] ↔ рэкруты і жаўнеры» (расійскай царскай арміі), што адпавядае канцу XVIIIстагоддзя, калі Запарожская Сеч пасля жорсткага супрацьстаяння была зачынена маніфестам імператрыцы Кацярыны II. Але, з другога боку, паводле некаторых тэкстаў – часам менавіта казакі забіраюць беларускіх сялян у рэкруты «наехалі казачэнькі рэкрутаў брацы» [8, 65, 81, 156], што, відаць, датычыцца ўжо XIX стагоддзя, калі на службе ў рускага царызма былі казакі з-пад Арэнбургу, Краснадара, Прыуралля (т.зв. яіцкія казакі).

Сярод геаграфічных лакацый, у межах якіх дзейнічаюць казакі, у беларускім познетрадыцыйным фальклоры ўзгадваюцца даволі вялізныя ўкраінска-беларуска-польскія абшары: ваколіцы Кіева Чэрнева і Магілёва, [8,66, 67], Беластоку [8, 229], Варшавы [8, 235]. Неаднаразова ўзгадваюцца ў фальклорных тэкстах ваенныя дзеянні казацтва супраць туркаў: «На турэцкія дарожанькі / Панясеш свае ножанькі / Панясеш свае плечкі / На турэцкія мечкі» [8, 76, 77, 81, 135]. Ёсць інфармацыя нават пра ўдзел беларусаў у вайне 1812 года, прычым, у тэкстах дакладна дыферэнцыруюцца а) французы; б) польска-літоўскія войскі (якія фактычна змагаліся на баку Напалеона за незалежнасць Вялікага княства Літоўскага супраць Расійскай імперыі); в) рускія імперскія войскі: «У Белымстоку на Бярозе / Стаіць войска расійскае, / А другое – паляцкае, / А трэцяе – французскае» [8, 134].

Пра буйныя маштабы ваенных аперацый казацтва на землях Беларусі сведчыць тое, што ў фальклорных крыніцах апавяданне ідзе пра даволі вялікую колькасць казакоў. У тэкстах неаднаразова ўзгадана: сем палкоў казакаў [8, 202], сотня казакоў з камандзірам [8, 232], ватага казакоў: «У паход за казакамі / Волю здабываць... / Збіраліся ватагамі... / Што цвет, малайцы, эй!» [8, 230, 231, 232]. Натуральна, што матэрыяльнае забеспячэнне буйных ваенных аперацый з вялікай колькасцю казакаў таксама павінна была быць даволі маштабнае, што знайшло адлюстраванне не толькі ў фальклоры, але і ў выяўленчым мастацтве земляў былой Рэчы Паспалітай нават пазней, на мяжы XIX–XX стагоддзяў. Прыкладам тут могуць быць эпічныя палотны таленавітага польскага мастака Юзэфа Брандта (1841–1915) [10], дзе падрабязна і ўважліва прамалёваны дэталі вопраткі, амуніцыі, зброі казакоў, іх музычныя інструменты, характэрныя рухі і постаці, убранне коней, транспартныя сродкі казачых табараў і ватаг (мал. 4). А таксама ў калекцыях антыкварных збораў Беларусі дагэтуль трапляюцца цікавыя экземпляры, звязаныя з адлюстраваннем казацкага побыту (мал. 5).

Тое, што ў большасці песень і апаведаў беларускага познетрадыцыйнага фальклору гаворка ідзе менавіта пра барацьбу беларускіх сялян і найбяднейшых гараджан у саюзе з казацтвам супраць магнатаў Рэчы Паспалітай і іх падначаленых, якія сялянства прыгняталі, сведчаць прыклады з тэкстаў, калі мэта наступу казакаў – шляхецкія і магнацкія маёнткі, якія ў выніку «агнём запылаюць» [8, 232]. Як вядома, у час змагання на Беларусі з уладамі і войскамі Рэчы Паспалітай казакі бралі штурмам не толькі маёнткі і замкі шляхты, але і буйныя, добра ўмацаваныя гарады.

Сумесная барацьба украінскіх казакаў і беларусаў, якія былі да іх далучаны, за самавызначэнне ды супраць асіміляцыі – сведчанне пошукаў самаідэнтыфікацыі нашых народаў, а не проста спроба «перакінуцца з-пад Польшчы – пад Расію». Пры жаданні міра і справядлівасці ўсім народам, якое ўскосна праходзіць праз позднетрадыцыйныя фальклорныя тэксты беларусаў, пра тое, што рускія (калі праяўляюць агрэсію і непавагу) часам успрымаліся як ворагі, сведчыць выраз «маскалі»: «З войска маскалі ступаюць» [8, 155]. А ваяры, ад імя і пра якіх апавядаюцца сюжэты фальклорных крыніц, часам узгаданы, як «рыцары»: «Ах, пайшла сястра бітым гасцінцам / да й спатыкае трох рыцарыў: / – Ці не бачылі майго брацейкі?» [8, 167].

У любым творы еўрапейскага мастацтва зухаваты ваяр без каханай жанчыны не ваяр, і фальклорныя тэксты беларусаў тут не выключэнне. Паводле айчынных песень, казацка-сялянскай вольніцы казак заўжды памятае і марыць пра сваё каханне, клапаціцца, збірае падарункі (каралі, золата, чаравічкі, пярсцёнкі) для сустрэчы са сваімі жанчынамі. Пры першай небяспецы для каханай казак адразу гатовы да яе «ехаць, каня гнаці, каб жыву застаці» [6, 378]. У якасці прыгожых і разумных жонак ці каханых казака ў познетрадыцыйных тэкстах называюцца жыхаркі Падоліі [8, 174] ці Валыні [8, 191, 194], – сумежных з беларускімі тэрыторыямі рэгіёнаў Украіны. У беларускіх песнях пра каханне, прапетых ад імя жанчын, казакі вельмі часта ўзгадваюцца не інакш, як «казача-сардэнька» [6, 266], «любы казачэнька» [6, 368], «мілы з Украіны» [6, 380] ды нават «мілы з Украіначкі» [6, 381]. Увогуле, у спецыяльным томе «Песніпракаханне»[6] айчыннага фальклорнага зводу «Беларуская народная творчасць» казакі ўзгаданы амаль у дзесятай частцы песень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Казак у беларускіх песнях абавязковапаўстае як падкрэслена заможна, стылёва іўрачыста апрануты дыпа ўсіх правілах вядзення ваенных дзеянняў,узброеньівершнік-ваяр. Ён едзе на моцным жвавым і спрытным кані з добрым убраннем, падабаецца дзяўчатам і жанчынам, умее прыгожа і якасна адпачыць і павесяліцца. Разам з тым, казак не баіцца загінуць за сваю справу – апекаванне над прыгнечанымі і барацьба з несправядлівасцю.

У большасці тэкстаў фальклорных крыніц беларусаў назіраецца наступная заканамернасць: калі сітуацыя, у якой казак узгаданы, станоўчая (ён паспяхова перамагае сваіх ворагаў, наведвае родных, заляцаецца да дзяўчат і жанчын), яго конь вараны ці «чорны» [8, 165]. Белая грыва звычайна надае вараному каню звышнатуральныя якасці. Напрыклад, здольнасць прадбачання і валоданне чалавечым маўленнем [8, 165]. Хаця ў фальклоры беларусаў няма містычнага вобраза казака Мамая, характэрнага для ўкраінскага мастацтва, сітуацыя, у якой беларусы апісвалі ў сваіх песнях казакаў вельмі часта надзвычайная, амаль чароўная, бо казацкі конь размаўляе са сваім гаспадаром (як і казак з канём), перадае яго словы бацькам і каханым, карацей, паводзіць сябе як зачараваная казачная істота. Сівы конь узгадваецца ў трагічнай, звязанай са смерцю казака, сітуацыяй: «Ой, на горцы агонь гарыць, / А ў даліне казак ляжыць, / На купінку галоўкаю, / Накрыў Вочкі муроўкаю»; «Там у полі полі яліна стаіць, / А пад той ялінаю ўбіты ляжыць, / А над тым убітым сівы конь стаіць»[8, 178, 179, 181], роўна, як і белы: «…коню, мой бялюсенькі» [8, 179].

Як у раннетрадыцыйным, так і ў познетрадыцыйным фальклоры, веданне чалавекам законаў камунікацыі са звярамі і птушкамі – вельмі часта сведчанне статуса культурнага героя, істоты двайной (чалавечай і зверхчалавечай) прыроды. У беларускіх фальклорных тэкстах часам апісваецца выпадак, калі казак-вершнік трымае на руцэ сокала: «У левай руцэ сокал сядзіць»[8, 190]. Казацкі сокал звычайна сівага колеру [8, 201]. Магчыма таму, што птушка – вядомы ў мастацтве вобраз «медыятара» (пасрэдніка) паміж рознымі светамі: гэтым і іншым; белым светам і светам цемры (чорным). Адсюль і сівы, шэры (мешаны з белага і чорнага кампанентаў) колер птушынага пер'я казацкага сокала. Ускоснае пацверджанне гэтаму – тэксты, дзе, часам, сокал гаворыць, зносіцца з казакам і яго роднымі [8, 197, 198].

Сярод надзвычай частага пункта дыслакацыі казака – карчма: «Да ў канец, канец мосту калінава / Да ляжыць галава дваранянінава, / А на той галаве карчомка стаіць, / А ў той карчомцы тры казакі пьюць» [8, 160, 187, 188, 193], дзе ён адпачывае, абменьваецца думкамі са сваімі сябрамі-казакамі і проста са знаёмымі і суразмоўцамі. Як вядома, мастацкае і сацыяльна-культурнае значэнне карчмы ў традыцыйнай культуры Беларусі – значна больш маштабнае, чым проста пітная ўстанова. Пра гэта пісалі вопытныя і ўважлівыя расійскія даследчыкі, напрыклад, Міхаіл Без-Карніловіч, параўноўваючы карчму беларусаў і расійскі кабак: «Корчма въ Белорусіи – ...место отдыха ...совета, брани и плясокъ ...танцуютъ подъ скрыпку, а чаще подъ свой народный инструментъ Дуду» [1, 26]. Сапраўды, у карчму беларусы прыходзілі на сустрэчу са свецкім (не культавым) мастацтвам, для абмеркавання пытанняў гаспадаркі і сямейнага жыцця, а прысутнасць у карчме ўводзіла чалавека ў мясцовую вясковую супольнасць. Таму казак у беларускай карчме не з'яўляецца аматарам п'янства, а прыняты ў «кола зносін» мясцовай супольнасці чалавек.

Трэба адзначыць, што значная частка казацкіх фальклорных сюжэтаў мае падкрэслена трагічны аспект: барацьба з ворагамі – справа небяспечная і часта вядзе казака да смерці. Таму сітуацыя, калі казак ляжыць у полі і, паміраючы, развітваецца з блізкімі ў сваіх думках, – стандартная для многіх фальклорных крыніц Беларусі: «У чыстым поле каліна стаіць… / Пад калінаю казак убіт ляжыць, / Над казаком сівы конь стаіць, Капытом сячэ, ваду дастае» [8, 189, 208]. У іх, побач з трагізмам сітуацыі, звычайна прысутнічае перакананне ў тым, што справа казака «правая», што ён не спрачаецца з лёсам і не шкадуе пра свой выбар лёсу. Думкі казака перад смерцю звязаны з будучыняй яго каханай, дзяцей, бацькоў, да якіх ён імкнецца даслаць праз сваіх саратнікаў ці каня зычэнні долі ці, нават, сваю спадчыну і весткі, якія павінны супакоіць родных: «Бяжы да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Мал. 2. Казак-бандурыст на карціне невядомага аўтара, пачатак XIX стагоддзя

Мал. 3. Казакі ў мастацтве XVII стагоддзя: партрэт Севярына Налівайкі (злева) і выява палка Марціна Небабы ў Гомелі, 1649 год (справа)





Мал. 4. Серыя карцін польскага мастака Юзэфа Брандта (1841–1915) з выявамі казакаў, 1867–1910 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарожкаю… / Прыбяжыш ты да вароцейкаў… / Ці не выйдзе маці мая… / Будзе пытаці свайго сына…/ Умей, косю, адказаціся. / Не кажы ты, што я ўбіт ляжу, / Кажы, косю, – ажаніўся, / Край Дунаю да пасяліўся» [8, 174, 186, 189].

Прыгожая і дарагая, якасная вопратка – адна з прыкмет казака, найбольш рэгулярна падкрэсленая ў беларускіх тэкстах. Негледзячы на складаны лёс, звычайна, казак у фальклорных аповядах і песнях беларусаў выглядаепрэзентабельна. Ён – «..малады-казак,-удалы» [8,139], у добрай фізічнай форме, мае густы чуб [8, 136], багатую і прыгожую шапку з чырвоным верхам, якая «…што мак расцвітае» [8, 231]. Яго кашуля – не з шэрага нябеленага льну, у які штодзённа апраналіся сяляне, а з тонкага белага палатна: «Рубашачка вісіць / Тонка-бела»[8, 202, 206]. Часам яна выраблена нават з шоўку: «Налажылі на казака / Шаўкову сарочку» [8, 233, 234], што, па сялянскіх мерках, – нявіданая раскоша. Бывае казацкая кашуля і чырвонай [8, 236]. І белая палатняная, і чырвоная шоўкавая кашулі казака ў песнях беларусаў выглядаюць урачыста, звычайна аздоблены вышыўкай «Налажылі на казака / вышыту сарочку»[8, 77, 236]. Гэта – прыкмета святочнага і рытуальнага адзення ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян.

Выверaны арыгінальны стыль адзення і адрознасць казака ад звычайных сялян заўважна пры першым поглядзе на сілуэт, абрысы яго фігуры, колеравую гаму постаці. Паводле ўзгадванняў у фальклорных крыніцах Беларусі, – казак, як правіла, апрануты не ў самаробную вясковую верхнюю нефарбаваную вопратку «някідкіх» натуральных (белага, шэрага) колераў, а ў дарагую і прыгожа пафарбаваную: у зялёны жупан [8, 136, 160], сінюю сукню [8, 232] ці блакітны жупан ці світу: «…у жупане галубенькім» [6, 300]. Давяршае ансамбль верхняй вопраткі адметны абутак: боты з жоўтай скуры[6, 300], а не сырамятныя шнураваныя пасталы ці мазаныя дзёгцем чорныя сялянскія боты. Заможнасць казакоў падкрэсліваюць і аксэсуары іх строяў. Сярод рэчаў казацкага абіходу – шаўковая хустка «кітайка-платок» [8, 189, 208], чырвоная шаўковая хустка [8, 207], прыгожы чырвоны шоўкавы пояс: «Чырвонаю кітайкаю / Ліčанька накрыта» [6, 300]. Ён мае залатыя пярсцёнкі: «Тры залатых персні» [8, 226]. Беларускія сяляне ў штодзённым побыце, ды і ў побыце святочным, не карысталіся такімі рэчамі.

Казакі мелі грошы як для разлікаў і гандлю, так і для задавальнення сваіх асабістых прыхільнасцей і звычак. Прыкмета незалежнага, не звязанага з падпарадкаваннем панам і шляхце ды працай на іх, прыватнага побыту казака – тое, што ён вольна і часта паліць сваю «люльку-цюцюнку» ці: «Курыць трубку табаку» [8, 133, 227, 237], – часам багата аздобленую. Ён – заможны чалавек з уласнымі наяўнымі сродкамі: мае «грошы ў шкатулцы» [8, 204], ці (што сведчыць пра вялікую заможнасць нават багацце казака), – у значна больш вялікай па памерах, чым шкатулка, «скрыні» [8, 232].

Кошт добрай шаблі, нават не аздобленай срэбрам ці золатам, у XVI–XVII стагоддзях дасягаў памераў гадавога жалавання вайскоўца, а булатны клінок з залатой насечкай каштаваў цэлае састаянне [2]. Шабля, этымалогія паходжання назвы якой звязана з гаворкамі і мовамі шэрагу народаў Еўразіі [11, 137], часам перадавалася як спадчына ў раду ваяроў. Шабля і іншыя прылады барацьбы і прафесійнай прыналежнасці да ваеннай супольнасці казака паводле беларускіх тэкстаў – багата і па-мастацку аздоблены каштоўнымі металамі. Ён узброены: ўпрыгожанай золатам зброяй: «Ой, на ём зброя, / Да ўсё залатая» [8, 231], – вострай шабляй [8, 134, 136, 138, 141, 165], ці нават мячом [8, 195, 231], з якога пераможна капае кроў [8, 233, 235]; парахавым ружжом [8, 141, 225, 226]. Трэба адзначыць, што колюча-сякучая зброя (меч, шабля, шпага) – паказчык высокага сацыяльнага статуса яе ўладальніка: у тагачаснай Еўропе іх мелі права насіць толькі прыналежныя да шляхты, дваранства, баярства і магнатэрыі асобы – нашчадкі радоў воінаў і лідэраў еўрапейскай супольнасці і роўныя ім па статусе прафесійныя вайскоўцы. Канстатацыя ў беларускім фальклоры фактаў, што казакі маюць лепшую на той час (XVI–XVII стагоддзе) якасную і вельмі дарагую зброю – сцвярджэнне разумення аўтарамі і носьбітамі фальклору здольнасці казацтва змагацца «на роўных» з любым праціўнікам ды любым войскам.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ





Мал. 5. Побыт казакаў у выявах на паштоўках пачатку XX стагоддзя (прыватны збор аўтара)

Тое, што казак як правіла мае час на самадасканаленне, заняткі мастацтвам, сцвярджае шэраг фальклорных тэкстаў беларускіх песень, апісваючых стаўленне казакаў да мастацтва. Паводле апошніх, ён ці сам валодае музычнымі інструментамі, ці наймае музыкаў, якія імі валодаюць, ражком і трубой: «Зайгралі ў ражок. / Як ішлі мы пад гару, / Зайгралі ў трубу» [8, 143], [8, 143], – скрыпкай і дудкай [8, 66, 67, 68, 136, 160], бандураю [6, 268], барабанам [8, 66, 67, 145].

Стандартнае ўбранне асноўнага транспартнага сродка вольнага ваяра – хуткага каня – таксама сведчанне паспяховасці і заможнасці казакаў ва ўяўленнях беларусаў. Конь казака ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

песенных апісаннях ходзіць пад аздобленым золатам сядлом: «А ў Кіеве-горадзе / Станавіліся / Залатыя сёдлачкі / Папыліліся» [8, 65, 74, 75, 79, 139, 140, 160], – сядлом з шоўкавай вышыўкай [8, 179] і шоўкавай папругай [8, 145] ды залатымі вудзіламі [6, 300]. Такое ўбранне для сваіх коней маглі сабе дазволіць на беларускіх землях XVI–XVII стагоддзяў толькі прывілегаваныя групы грамадства, прыгнятальнікі сялян, – магнаты і шляхта. Тое, што казакі мелі магчымасць убіраць сваіх коней на роўных з магнатамі і шляхтай ці мець ад іх трафеі – сведчанне разумення носьбітамі фальклору (сялянамі) казакаў як роўных па магчымасцям і патэнцыялу супраціўнікаў шляхецка-магнацкага прыгнёту.

Варта падкрэсліць, што спецыфіка прадстаўлення артэфактаў матэрыяльнай культуры казакаў у беларускім познетрадыцыйным фальклоры сведчыць пра наступныя акалічнасці: а) сацыяльна-гістарычныя абставіны, якія абумовілі з'яўленне казакаў на беларускіх тэрыторыях, абумоўлены пошукам самавызначэння і самаідэнтыфікацыі беларусаў і ўкраінцаў ва ўмовах спробаў асімiляваць і замацаваць прыгнёт нашых народаў з боку магнатаў Рэчы Паспалітай; б) крыніцы, прадстаўляючыя казакаў і артэфакты іх матэрыяльнай культуры у помніках фальклору беларусаў – перадусім сацыяльна-бытавыя песні і, у меншай ступені, песні пра каханне і іншыя жанры познетрадыцыйнага фальклору, за рэдкім выключэннем апісваючыя гістарычныя падзеі на беларускіх тэрыторыях XVI–XVII стагоддзяў; в) фальклорныя помнікі Беларусі, апісваючыя казацкую матэрыяльную культуру (з акцэнтацыяй яе мастацкай і эстэтычнай каштоўнасці і прывабнасці), блізкія па сваім светаадчуванні да замацавання за казакам статуса культурнага героя, засяроджанага на апекаванні прыгнечанымі ды на барацьбе з несправядлівасцю.

**Крыніцы і літаратура**


1. Без-Корнилович М. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии: справочное издание факсимильного типа. – Минск : Алвит,1995. – 320 с.
2. Волков В. Русская рать: испытание смутой. Мятежи и войны начала XVII столетия. – М. : Прометей, 2017. – 340 с.
3. Калацэй В. Каляндарная і працоўная раннетрадыцыйная класіка песень Беларускага Паазер'я і Паўднёвай Аўкштайтыі // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей: нацыянальныя меншасці на Беларусі і ў свеце. – Брэст, 1997. – № 2. – С. 3–4.
4. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры / рэд. калегія : В.Барысенка і інш. – Т. 1. З старажытныхчасоў да канцаXVIII ст.– Мінск : Навукаі тэхніка, 1968. – 448 с.
5. Мухаринская Л.Белорусская народная песня. Историческое развитие (Очерки) / ред. З. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1997. – 216 с.
6. Песніпракаханне / уклад., сістэматызацыятэкстаў, уступ. артыкул і камент. І. Цішчанкі ; уклад. муз. часткі С. Нісневіч; рэд. А. Фядосік, Г. Цітовіч. – Мінск : Навукаі тэхніка, 1978. – 616 с.
7. Саверчанка І. Старажытнаяпаэзія Беларусі: XVI–першая палова XVII ст. / рэд. А. Мальдзіс. – Мінск : Навукаі тэхніка, 1992. – 254 с.
8. Сацыяльна-бытавыяпесні / уклад., сістэматызацыятэкстаў, уступ. артыкул і камент. І. Цішчанкі, В.Скідана; уклад. муз. часткі Г. Таўлай; рэд. А. Фядосік. – Мінск : Навукаі тэхніка, 1987. – 488 с.
9. Таўлай Г. Мелодыкапесень з сацыяльна-бытавымісюжэтамі // Сацыяльна-бытавыяпесні / уклад., сістэматызацыятэкстаў, уступ. артыкул і камент. І. Цішчанкі, В.Скідана; уклад. муз. часткі Г. Таўлай; рэд. А.Фядосік. – Мінск : Навукаі тэхніка, 1987. – С. 22–40.
10. Brandt, Josef von (1841–1915), Painter // Benezit Dictionary of Artists. – Oxford : Oxford University Press, 2006. – P. 88–96.
11. Stachowski M.The origin of the European word for sabre // Studia Etymologica Cracoviensia. – vol. 9. – Krakow: Jagiellonian University Press, 2004. – P. 133–141.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ